Я. Ю. Субат

# СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ ВОБРАЗА АМЕРЫКІ Ў ПАЭМЕ ЭДРЫЕН РЫЧ «АТЛАС СКЛАДАНАГА СВЕТУ»

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*uugini@gmail.com;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Разгледжана мастацкая спроба Эдрыен Рыч пераасэнсаваць паўночна-амерыканскі нацыянальны наратыў за кошт змены культурнага і палітычнага кодаў, пакладзеных у падмурак новага спасціжэння. Прааналізаваны прынцыпы рэвізавання светапогляднай сістэмы, асаблівасці хранатопа, адзначаны спецыфічныя рысы вобразнай сістэмы паэткі на прыкладзе паэмы «Атлас складанага свету» («An Atlas of the Difficult World»).

***Ключавыя словы:*** амерыканская літаратура; рэвізія; нацыянальная ідэнтычнасць; нацыянальны наратыў.

Літаратурная творчасць амерыканскай паэткі, эсэісткі і філасафа Эдрыен Рыч непарыўна звязана з яе палітычнымі поглядамі: выбітная феміністка другой хвалі, антымілітарыстка і ўдзельніца праваабарончага руху, Э. Рыч паслядоўна звяртаецца да гэтых ідэй як у шматлікіх крытычных працах і філасофскіх эсэ, так і ў лірыцы.

Адным са сродкаў аналізу і крытыкі сучаснай культурнай прасторы Эдрыен Рыч бачыць пераасэнсаванне, рэвізію («re-vision»). У праграмным для феміносцкіх штудый эсэ «Калі мы, памерлыя, прачынаемся: пісьменніцтва як рэвізія» («When We Dead Awaken: Writing as Re-vision», 1971) яна прапануе пісьменніцам і паэткам пераглядаць і пераасэнсоўваць вядомыя тэксты, створаныя аўтарамі-мужчынамі, – толькі такім чынам, лічыць Э. Рыч, жанчына можа выйсці за межы патрыярхальнай оптыкі: «Рэвізія – акт азірання назад, бачання свежым поглядам, уваходжання ў стары тэкст у крытычным кірунку – гэта для жанчыны больш, чым глава ў гісторыі культуры: гэта акт выжывання… Нам варта ведаць пісьменніцтва мінулага, разумець яго інакш, чым разумелі раней; каб не працягваць традыцыю, а разбураць яе ўладу над намі» [1, p. 167]. [Пераклад з англійскай тут і далей мой – Я. С.]. Цягам часу кантэкст выкарыстання метаду рэвізіі пашыраецца – у позняй лірыцы Эдрыен Рыч звяртаецца да

своеасаблівага мастацкага пераасэнсавання гісторыі Паўночнай Амерыкі, яе нацыянальнага наратыву.

Прыкладам такой нацыянальна-арыентаванай рэвізіі з'яўляецца паэма «Атлас складанага свету» («An Atlas of the Difficult World», 1991) – першая структурная частка аднайменнага зборніка, напісанага на працягу 1988–1991 гадоў. «Атлас» стаў вынікам рэфлексіі паэткі над тагачасным станам амерыканскага грамадства, выявіўся спробай перагледзець дамінуючы ў агульнай свядомасці вобраз краіны і адлюстраваць глыбінныя працэсы, якія маюць уплыў на паўночна-амерыканскі наратыў. Як сведчыць назва, паэма ўяўляе сабой экзэрсіс у картаграфіі, каталагізацыю найбольш вызначальных элементаў амерыканскай рэчаіснасці; мастацкая інтэнцыя Эдрыен Рыч – стварэнне прынцыпова новага вобраза краіны, новай «карты» Амерыкі. Падобна да феміністкай рэвізіі тэксту, мэта якога – пераадольванне дамінуючага ў культуры светапогляду, пераасэнсаванне амерыканскага наратыву адбываецца праз Іншага і яго пункт гледжання. Калі ў патрыярхальнай сістэме пад Іншым разумеецца жанчына, то ў капіталістычнай і імперыялістычнай краіне – любая прыгнечаная сацыяльная група, якая не атрымлівае рэпрэзентацыі як у палітычным, так і ў культурніцкім кантэксце.

Падкрэсліваючы ўласную арыентацыю на пераасэнсаванне звыклага вобраза Амерыкі, у другой частцы «Атласа» Э. Рыч вызначае спецыфіку сваёй мастацкай картаграфіі: «Я абяцала паказаць табе карту ты кажаш але гэта мурал / тады хай будзе так гэта невялікія адрозненні / адкуль мы глядзім вось у чым пытанне» [1, р. 144]. Супрацьпастаўленне «карта–мурал» з'яўляецца для Эдрыен Рыч прынцыповым: геаграфічная карта – прадмет аб'ектыўнай рэчаіснасці, абагульненая выява, мурал – суб'ектыўны твор мастацтва, які дазваляе існаванне розных пунктаў гледжання. Паэтка канструюе вобраз Амерыкі на ўзроўні асобных наратываў, спалучаючы розныя гісторыі ў цэласную карціну, у якой становяцца чутнымі тыя галасы, якія звычайна ігнаруюцца – галасы імігрантаў, этнічных і расавых меншасцяў, прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці і г. д. Суб'ектыўнасць апавядання задаецца ў першай частцы «Атласа», дзе праз чатырох неназваных прамоўцаў Э. Рыч перадае чытачу агульнае адчуванне згубленасці ў часе і прасторы, што пануе ў амерыканскім грамадстве: «Хтосьці піша: / "Камары прасочваюцца праз шчыліны ў сценах гэтай хаткі, дарога / ўзімку непраходная, / Я жыву тут таму мне не даводзіцца выходзіць

ды дзейнічаць, / Я спрабую трымацца за жыццё, але адчуваю пустэчу”» [1, p. 142].

Картаграфія Эдрыен Рыч спалучае ў сабе як рэальныя, так і выдуманыя месцы: так, напрыклад, у другой частцы «Атласа» Амерыка паўстае перад чытачом амаль казачнай, штучнай краінай з характэрнымі «гаворачымі» тапонімамі («Here is a map of our country: / here is the Sea of Indifference, glazed with salt…» [1, p. 144]) і абстрактнымі, безыменнымі аб’ектамі («This is the haunted river flowing from brow to groin / we dare not taste its water / This is the desert where missiles are planted like corms» [1, p. 144]). Асаблівую ўвагу Эдрыен Рыч надае выбару рэальна існуючых месцаў, з якіх складаецца яе мастацкая мапа – згодна са стратэгіяй рэвізіі, паэтка наўмысна не абірае тыя аб’екты, сімвалічнасць якіх трывала замацавана ў масавай культуры (напрыклад, гару Рашмор ці Джэймстаўн). У разуменні Э. Рыч, такія месцы ўвасабляюць каштоўнасці дамінуючых у грамадстве груп, таму з’яўляюцца заведама не рэпрэзентатыўнымі, непрыдатнымі для паўнавартаснага і пераасэнсаванага вобраза Амерыкі. Замест іх у «Атлас» уключана тое, што адлюстроўвае ў першую чаргу крывавыя, «ганебныя» старонкі амерыканскай гісторыі: «Зларі калі зможаш момант сваёй краіны, пачні / дзе абрываюць кожны каляндар: Апаматакс / Вундэд-Ні, Лос Аламас, Сэльма, апошняя перакідка з Сайгона» [1, p. 148].

Кожнае з пералічаных месцаў звязана з трагічнымі падзеямі: у мястэчку Апаматакс афіцыйна завяршылася Грамадзянская вайна, ручай Вундэд-Ні стаў у 1890 годзе месцам адной з апошніх бітваў перасяленцаў з карэнным насельніцтвам, а праз амаль сто гадоў быў захоплены ўдзельнікамі Руху амерыканскіх індзейцаў (AIM, American Indian Movement) падчас пратэстаў супраць прыгнечання з боку дзяржавы. У горадзе Лос-Аламас была распрацаваная атамная бомба, з Сэльмы да Мантгомеры ішлі маршы афраамерыканскага насельніцтва за свае правы, а ў Сайгоне размяшчалася база Злучаных Штатаў падчас вайны ў В’етнаме. Варта адзначыць спецыфіку часа-прасторавага адзінства ў лірыцы Эдрыен Рыч: месца бачыцца ёй неадрыўна звязаным з гістарычнымі падзеямі, якія там адбываліся – менавіта таму ў пятай частцы паэмы Апаматакс, Вундэд-Ні, Лос-Аламас, Сэльма і Сайгон названы «момантамі», бо ўяўляюць сабой не столькі фізічную кропку на мапе, колькі сімвалічны вобраз падзеі, уключаны ў паўночна-амерыканскі наратыў. Неабходнасць такога разумення абгрунтоўваецца Э. Рыч у эсэ «Нататкі пра палітыку месцазнаходжання» («Notes Toward a Politics of Location», 1984): «Мне трэба

разумець, што месца на мапе – гэта таксама месца і ў гісторыі, у межах якога я – жанчына, габрэйка, лесбіянка, феміністка – створана і спрабую ствараць» [2]. Паэтка падкрэслівае неабходнасць адыходу ад пункту гледжання, досведу і каштоўнасцяў белага насельніцтва краіны праз разуменне свайго «месца», сваіх каранёў. Статус Іншай (як жанчыны, лесбіянкі, габрэйкі) дазваляе Эдрыен Рыч выходзіць па-за межы дамінуючага пункту гледжання (мужчынскага, гетэрасексуальнага, «белага» ў шырокім сэнсе); канструюючы ўласны вобраз Амерыкі, яна кіруецца ў першую чаргу разуменнем разнастайнасці насельніцтва, плюралізму ідэнтычнасцяў.

Варта адзначыць, што не толькі геаграфічна-гістарычныя аб’екты складаюць шматгранны вобраз Амерыкі ў «Атласе», але і людзі – як рэальныя, так і ананімныя, абагульненыя фігуры. Да першых належаць Рэбэка Райт (жанчына, забітая студэнтам Сцівенам Карам у 1988 годзе) і Клаўдыя Брэнар (яе каханка), Эн Саліван (вядомы педагог і кампаньёнка слепа-глухой пісьменніцы Хэлен Картэр), Джордж Джэксан (афраамерыканскі актывіст, пісьменнік і праваабаронца, асуджаны і забіты ў турме); другім, ананімным чытачам, цалкам прысвечана трынаццатая і апошняя частка паэмы, «dedications».

Выбар персаналій, з якіх складаецца вобраз краіны, як і выбар месцаў, прадыктаваны ў першую чаргу мастацкай накіраванасцю на рэвізію нацыянальнай ідэнтычнасці і жаданнем зрабіць чутнымі тыя галасы, якія застаюцца па-за межамі капіталістычнага, андрацэнтрычнага і «белага» светапогляду. Складаны вобраз Амерыкі, яе мапа, канструюецца Эдрыен Рыч з дапамогай разнастайнага шэрагу элементаў, аб’яднаных агульнай мэтай – пераасэнсаваць і перапісаць паўночна-амерыканскі нацыянальны наратыў, зрабіўшы яго адпаведным досведу прыгнечаных у грамадстве груп.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Rich A. C.* Adrienne Rich’s poetry and prose: poems, prose, reviews, and criticism / selected and edited by Barbara Charlesworth Gelpi, Albert Gelpi. W. W. Norton & Co, Inc. New York, 1993.

2. *Rich A. C.* Notes Toward a Politics of Location. URL: https://people.unica.it/fiorenzoiuliano/files/2014/10/Adrienne-Rich-Notes-Toward-a-Politics-of-Location.pdf (date of access: 15.04.2021).